*Марына Партоліна*

# АСАБЛІВАСЦІ ТРАНСЛЯЦЫІ АБРАДУ КУПАЛЛЕ НА ПАДЗВІННІ

Наша традыцыйная культура не змагла б выжыць, калі б не існавала спосабаў яе трансляцыі паміж пакаленнямі. На працягу гістарычнага шляху сучасных еўрапейскіх этнасаў склаліся некалькі такіх спосабаў ці форм. Адна з такіх гістарычна існуючых форм пераемнасці – абрад. ‹‹Абрад – гэта сукупнасць традыцыйных умоў дзеянняў, якія сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей да прыроды і паміж сабою, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях, што рэгулярна паўтараюцца›› [1, 15]. Сёння рэлігійная рытуальная сутнасць, якая пакладзена ў аснову этнічнай абраднасці, часцей за ўсё страчана, але знешне абрад часам працягвае існаваць па прынцыпу ‹‹так было ад веку››, і сваім існаваннем дэманструе адрозненне дадзенага этнасу ад усіх астатніх. Зараз традыцыйны абрад часцяком прадстаўляе сабою з’яву, што з культа перайшла ў побыт, страціла магічны і рэлігійны сэнс (нашы сучаснікі святкуюць свята, зусім не звязывая яго з містычнай, рэлігійнай першаасновай).

Заснаваная на старажытных магічных уяўленнях, купальская абрадавая традыцыя слаба адклікалася на падзеі жыцця навейшых эпох, яна магла існаваць толькі ў асаблівых сацыяльна-эканамічных умовах. У гэтым дачыненні пераважна замкнуты, аседла-земляробчы лад жыцця беларускага сялянства на працягу стагоддзяў сыграў вырашальную ролю ў параўнальна доўгім захоўванні многіх архаічных абрадаў. Але імклівае змяненне ўмоў жыцця, знікненне традыцыйнай вясковай суполкі, а таксама распаўсюджвання стандартнай адукацыі і гарадской культуры ў XX ст. сталі падставай хуткага згасання традыцый. Аднак многія экспедыцыйныя даследванні сведчаць, што звычаі Купалля не толькі захоўваюцца ў памяці нашых сучасных старажылаў, але побытава існуюць у мностве гульнёвых варыянтаў пераасэнсаванага абраду.

Апісанні купальскай абраднасці ў этнаграфічнай літаратуры XIX-XX стст., сучасныя назіранні дазваляюць зрабіць выснову, што святкаванне Купалля ў розных частках Беларусі не было тоесным. Пры наяўнасці ў абрадавых дзеяннях розных рэгіёнаў многіх агульных момантаў, тут выяўляюцца і істотныя разыходжанні.

Сёння, апрача лакальных адрозненняў, для купальскай традыцыі Падзвіння характэрна гістарычная шматпланавасць. У адных мясцовасцях Купалле адзначаецца ў больш старажытных, набліжаных да аўтэныічных сваіх формах, у другіх – у значна мадэрнізаваным выглядзе. Натуральна, і ў межах адной абрадавай традыцыі поруч са старажытнымі купальскімі элементамі сустракаюцца параўнальна новыя іх пераасэнсаванні.

У этнаграфічных апісаннях Купалля на Падзвінні на першы план выступаюць розныя ачышчальныя абрады (распальванне вогнішчаў, скокі праз іх, купанне), што, аднак, яшчэ не сведчыць аб іх самастойным абрадавым значэнні. Гэта, хутчэй усяго, толькі фрагменты абраду, які складаецца з мноства элементаў, і які валодае складанай сцэнарнай структурай.

У.Проппам былі выяўлены асноўныя тыпы культаў аграрных абрадавых урачыстасцей, якія магла ўключаць у сябе купальская абраднасць. Гэта культ раслін, культ продкаў, рытуальная ежа, абрадавае пахаванне, магічныя заклінанні, абрадавыя абыходы двароў, абрадавыя ігрышчы і забавы і г.д. [2]. Натуральна, што не ўсе элементы з аднолькавай выразнасцю захаваліся да нашага часу. Не зусім пэўна выяўляюцца ў купальскай абраднасці матывы пакланення продкам. Аднак, падчас палявых даследванняў, выяўляюцца сведчанні аб наяўнасці ў купальскім абрадавым рытуале ўсіх пералічаных кампанентаў. На жаль, не шмат сёння праводзіцца навуковых даследванняў, каб выявіць гэта дасканала. Але мы можам аднавіць і захаваць тое, што мы маем, праз уводзіны самога абраду (яго гульнёвых варыянтаў і мастацкіх рэканструкцый) ў сацыяльную практыку.

У некаторых мясцовасцях Падзвіння, дзе захаваліся ўстойлівыя суполкі традыцыйных спявачак, цікавасць насельніцтва да свята, Купалле праводзіцца спантанна, пры мінімальных намаганнях спецыялістаў галіны культуры. Гэта – напрыклад, вёска Вуглы Полацкага раёна, дзе ад спявачак Любові Змітраценка і Вікторыі Ермаловіч фалькларысты маглі запісаць песні ўсіх этапаў Купалля, а жыхары вёскі і іх суседзі праводзяць купальскую ноч ля вогнішча са спевамі песень-антыфонаў і побытавымі танцамі пад скрыпку, бубен з калатушкай і дыятанічныя цымбалы.

Побач з натуральным, аўтэнтычным спосабам існавання абраду, адным са сродкаў трансляцыі фальклорных святаў з’яўляецца рэканструкцыя. Але, тут непазбежна паўстае праблема яе аўтэнтычнасці. Людзей, якія займаюцца сёння рэканструкцыяй святаў умоўна можна падзяліць на дзве групы. Першая – гэта даследчыкі-прафесіяналы, якія выкарыстоўваюць у сваіх працах толькі навукова пацверджаныя звесткі з уласных экспедыцый, або матэрыял агульнапрызнаных этнаграфічных даследванняў. Другая – аматары, якія дзеля перакanaўчага (на іх погляд) канчатковага выніку на прамежкавых этапах рэканструкцыі часта выкарыстоўваюць не толькі ненавуковыя звесткі, але і крыніцы, якія супярэчаць гістарычным фактам, і якія падпадаюць пад сур’ёзную крытыку навукоўцаў.

Кожная з гэтых груп карыстаецца пэўным наборам літаратуры. Першая, у асноўным, гісторыка-археалагічнымі фундаментальнымі трудамі і агульнапрызнанымі этнаграфічнымі даследваннямі. Другая выкарыстоўвае разам з вышэй пералічанамі тыпамі крыніц яшчэ і папулярную і псеўданавуковую літаратуру. Папулярная літаратура не ставіць перад сабой мэты навуковага аналізу этнаграфічнага матэрыялу, і гэта не ўтойваецца; яна мусіць быць зразумела і шырокаму колу чытачоў. Таму ў ёй часам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляецца спрашчэнне, вольнае пераказванне тлумачэнняў і фактаў. Такія крыніцы небяспечныя тым, што часцяком яны выкарыстоўваюцца не толькі для доказу няпэўных гіпотэз і палажэнняў, але і ў якасьці базы для другасных навуковых даследванняў і практычнай дзейнасці.

На сучасным Падзвінні рэканструкцыяй традыцыйных абрадаў займаюцца людзі, хучэй прыналежныя да групы аматараў, паколькі толькі адзінкі з іх маюць блізкую да фалькларыстычнай адукацыю. Пры гэтым «у ход» ідуць элементы, запазычаныя ад маскультуры і кітча: плаванне ў вадаёмах на платах і лодках з распяваннем купальскіх песень, шэсці з харугвамі і паходнямі пад барабанны грукат, узмацнёная электрычнай апаратурай музыка псеўдарыцарскіх калектываў кшталту «Старага Ольсы», дыскатэкі і гандлёвыя рады ў купальскую ноч, што не толькі адмаўляе каранёвую традыцыю, але, праз падмену, пагражае яе знішчэннем.

Часам і рэканструктары-прафесіяналы ў сваім жаданні «дакапацца да каранёў», адасобіцца ад маскультуры, даходзяць да спрэчных новатвораў. Так, праз захапленне балцкай канцэпцыяй этнагенезу беларусаў у асяродку маладзёжнага фальклорнага руху прывяло да будаўніцтва «купальскіх брамаў» перад купальскай пляцоўкай, апранання ў аздобленыя металічнымі ўпрыгожаннямі і нашыўкамі археалагічныя строі. Магчыма, гэта і было характэрна да сярэднявечнага Падзіння, цераспалосна заселянага балтамі і славянамі, але ці пісьменна гэта спалучаць са спеўным і інструментальна-музычным рэпертуарам, запісаным ад беларускамоўных падзвінскіх сялян у XX і XXI стагоддзях?

Натуральна, што сёння трансляцыя каранёвых культурных норм у асяродку новага пакалення можа разглядацца як частка агульнага працэсу сацыялізацыі ў рамках самаўзнаўлення культуры. Праз прадстаўнікоў розных пакаленняў, што бяруць удзел у купальскіх рытуалах, здзяйсняецца перадача ад старэйшых да малодшых чальцоў грамадскай супольнасці цэлага пласта традыцыйнай культуры. Перадаваемая інфармацыя ўключае ў сябе нормы паводзін, прынятыя ў дадзеным грамадстве, а таксама тыя светапоглядныя ідэі, каштоўнасці, што пэўная культура выпрацавала на працягу свайго існавання, альбо ўключыла ў сваю сістэму шляхам запазычання.

Так, каб не прыйшлося карыстацца «не той» інфармацыяй пры захаванні і рэканструкцыі Купальскага абраду, каб не прыйшлося «адраджаць з попелу» свае забытыя традыцыі і сваю каранёвую культуру, трэба ахоўваць «тое, што ў побыце», што можна назіраць і чуць непасрэдна ад носьбітаў аўтэнтычнага фальклору. Няхай гэта і не заўсёды выглядае сцэнічна і відовішчна, але – праверана часам і генетычна сваё. Рабіць гэта трэба менавіта сёння, калі носьбіты традыцыі яшчэ побач з намі. Паколькі аддаленая будучыня этнасу не адбудзецца без сённяшняга захавання яго традыцый.

**Спіс літаратуры:**

1. Музычны слоўнік беларуска-рускі / рэдкал. : Г.Р. Куляшова, Л.А. Антанюк. – Мінск : Бел. навука, 1999. – 559 с.: нот., іл.
2. Пропп, В.Я. Русские аграрные праздники / В.Я. Пропп – Л. : Знание, 1963. – 143 с.
3. Тавлай, Г.В. Белорусское купалье : Обряд, песня / Г.В. Тавлай. – Минск : Наука и техника, 1986. – 174 с.: ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ